ДУ «Сетка публічных бібліятэк горада Гомеля»
дзіцячая бібліятэка-філіял №10 імя В.Ю. Драгунскага



# Майстар слова з душой летуценніка

## Віртуальная кніжная выстава да 75-годдзя беларускага паэта, празаіка і перакладчыка Віктара Канстанцінавіча Гардзея

Гомель, 2021

**Віктар Канстанцінавіч Гардзей** нарадзіўся 19 **жніўня 1946** года ў вёсцы **Малыя Круговічы** Ганцавіцкага раёна. Як і ў большасці дзяцей пасляваеннага часу, яго маленства было няпростым. Галодныя пасляваенныя гады былі непараўнальна меншым няшчасцем для хлопчыка, чым страта маці. Пазней паэт прызнаваўся: “Успомніць бы матчыны вочы, згадаць бы, хто хлеба даваў“. Але сваякі і аднавяскоўцы не далі ў крыўду Віцю. Прытулак ён знайшоў у сям’і дзеда Сцяпана. Выхаваннем будучага пісьменніка займаліся, па яго ўспамінах, цётка Альжбета ды настаўнікі роднай Вялікакруговіцкай сярэдняй школы.

Значная заслуга ў развіцці літаратурнага таленту Віктара Гардзея належыць настаўніку рускай мовы і літаратуры Вячаславу Несцяруку. У 1963 годзе, калі Віця яшчэ навучаўся ў школе, ў газеце «Піянер Беларусі» было надрукавана яго першае апавяданне «**Памылка**».

Пасля заканчэння Вялікакруговіцкай сярэдняй школы (1964) Віктар Гардзей працаваў у мясцовым калгасе «Сцяг Леніна», а потым у ляхавіцкай раённай газеце «Будаўнік камунізму», з 1966 года – у ганцавіцкай раённай газеце «Савецкае Палессе». З 1983 года жыве ў Мінску, працаваў у часопісах «Беларусь», «Родная прырода», «Маладосць», «Полымя», «Вожык», у выдавецтве «Мастацкая літаратура». У 1984 годзе завочна скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Творчы ўзлёт Віктара Гардзея як пісьменніка адносіцца да ганцавіцкага перыяду, калі ён працаваў у раённай газеце, якую на той час рэдагаваў вядомы журналіст і пісьменнік **Васіль Фёдаравіч Праскураў** – яго першы настаўнік і дарадца. Менавіта тады Віктар Гардзей выдаў свае першыя **кнігі паэзіі «Касавіца» (1975), «Верасное палясоўе» (1978), «Засевак Радзімы» (1983)**. З **1979** года – член Саюза пісьменнікаў БССР, Саюза беларускіх пісьменнікаў, з **2006** года – у Саюзе пісьменнікаў Беларусі.




















Пяру Віктара Гардзея належаць таксама **паэтычныя зборнікі**: **«Незабудкі азёр»** (1985), **«Узрушэнне»** (1988), **«Дзікая пчала»** (1994), **«Зялёныя дажджы»** (1997), **«Межань»** (1999), **«Трыадзінства»** (2010).

Адметнай рысай гардзееўскай **лірыкі** з’яўляецца замілаванасць **краявідамі малой радзімы**, многія яго творы напісаны менавіта на рэгіянальным матэрыяле Берасцейшчыны. У сваіх вершах паэт звяртаецца да **вясковага пейзажу** з яго тыповымі для Палесся разгалінаваннямі: лясным, рачным, лугавым. Аб гэтым выразна сведчаць назвы твораў: “Крыніца булькае бруіста…”, “Так зелена поле рунела…”, “У пушчы”, “Свіцязь”, “Слёзкі лугавыя”, “Малінавае лета”, “Незабудкі азёр”, “Лотаць”. Акрамя пачуцця захаплення пейзажамі Ганцаўшчыны, адметнасцю пейзажнай паэтыкі з’яўляецца адзінства аўтара, лірычнага героя з акаляючым асяроддзем – жывёльным і раслінным светам **прыроды**. Прылёт буслоў, сімвалаў беларускага Палесся, на думку паэта, нясе землякам толькі шчаслівыя імгненні: “будзь хлебны год, будзь ураджайны!“. Лірычнаму герою вершаў В. Гардзея прыемна ўсведамляць свае гарманічныя ўзаемаадносіны з прыродай. Зязюля яму прадказвае ўдачу, а, у сваю чаргу, лірычнаму герою радасна слухаць перапёлачку ў “зялёнага жыта разлівах“. Ён аберагае гняздо жаўранкаў, не дазваляючы там сабе, згодна з павер’ем, загаварыць ці пасмяяцца, каб не выдаць малечу кажану: “гнязду дабро вяшчую“.

Талент пісьменніка заззяў новымі фарбамі пасля з'яўлення ў друку ягоных апавяданняў, аповесцей, раманаў, якія склалі кнігі "**Дом з блакітнымі аканіцамі**" (1984), "**Карані вечнага дрэва**" (1988), "**Уратуй ад нячыстага**"(1992), **«Ці то грэбля, ці то гаць», «З мінулага не вяртаюцца…», трылогія «Аселіца ў басейне Чорнага мора», раман «Бедна басота»** (2003). і інш. Героі гэтых твораў і хлопчык-сірата пасляваенных гадоў, і нашы сучаснікі, якім неабыякавы лёс краіны, яе будучыня, і тыя, хто перашкаджае пастунальнаму руху грамадства.












Вельмі цікавая і самабытная **проза** В. Гардзея – надзіва псіхалагічная, прасякнутая нязменным гумарам. Ужо ў аповесці "**Дом з блакітнымі аканіцамі**", якая дала назву першай аднайменнай кнізе, выразна выявілася адметнасць таленту празаіка: пісаць пра тое, што стала дарагой часткай аўтабіяграфіі. Кнігай "**Карані вечнага дрэва**" В. Гардзей паказаў, наколькі добра ён ведае жыццё і ўмее са шматлікіх фактаў выбіраць тое, што заслугоўвае пільнай пісьменніцкай увагі. Раман "**Бедна басота**" створаны на блізкім аўтару матэрыяле. У ім аўтар не абыходзіць праблемы, якія ў савецкі час далікатна абміналіся – першыя гады калектывізацыі на Заходняй Беларусі. В. Гардзей узнаўляе жыццё заходнебеларускай вёскі пасляваеннага часу. За кнігу прозы "**Уратуй ад нячыстага**" (1992) В. Гардзею прысуджана Літаратурная прэмія імя І. Мележа.



















І **для юных чытачоў** В. Гардзей піша з зайздросным пастаянствам. На яго рахунку **вершаваныя кнігі**: “**Чырвоны грабеньчык**” (1976), “**На арэхавай палянцы**” (1982), “**Коцікі на вярбе**” (1988), “**Мой тата – трактарыст**” (1989), “**Зай, які лічыў варон**” (1991), “**Зайкава балалайка**” (1998), «**Сарочына цырульня**» (2013).

Таленавітыя вершы В. Гардзея добра ведаюць і любяць дзеці, яны прасякнуты нязмушаным гумарам, назіральнасцю аўтара, жыццялюбствам і тонкім адчуваннем свету, што адразу бярэ ў палон чытача. Чытанне яго вершаў і вершаваных казак заўсёды вясёлае і пазнавальнае, а, значыць, несумненна карыснае. Часцей за усё асноўнай тэмай з’яўляецца тэма **роднай прыроды** і працы чалавека. Акрамя вершаў кожны маленькі чытач можа знайсці на старонках дзіцячых кніжак В. Гардзея і небыліцы, і пацешкі, і вясёлыя жарты, і іншае.




У 2013 годзе выйшла кніга В. Гардзея «**Мудры воран**». Адрасаваная яна дзецям малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. У ёй паэтычнай мовай узноулены самыя цікавыя легенды і паданні з надзвычай багатай фальклорнай спадчыны беларускага народа. Многія творы маюць міфалагічны і чарадзейны змест, асобны раздзел склалі народныя прымхі, павер’і, казкі, звязаныя з жыццём звяроў і птушак, прыроды наогул.




Кнігі В. Гардзея для дзяцей напісаны паводле ўласнага досведу і вопыту аўтара, яны нясуць у сабе вялікі **пазнавальны і выхаваўчы** патэнцыял.







Асобна хочацца вылучыць двухтомнае выданне пісьменніка, якое пабачыла свет у 2008-2010 гадах чатырохтысячным тыражом, “**Малую дзіцячую Чырвоную кнігу**”. Гэта ўнікальны, маляўніча, з густам афармлены твор, свайго роду сапраўдны шэдэўр. Падобных яму ў Беларусі дагэтуль не было. Ён спалучае ў сабе паэзію і прозу, цікавыя энцыклапедычныя звесткі і здзіўляючую назіральнасць, навукова-кампетэнтную дасведчанасць аўтара аб рэдкіх і знікаючых відах дзікіх жывёл, птушак, земнаводных (1-ы том) і раслінах, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі (2-гі том), у даступнай форме апавядае пра іх. Але не толькі ў гэтым каштоўнасць кнігі. Найгалоўнейшая яе мэта – прывіць дзецям любоў да непаўторнай прыроды роднага краю і, зрэшты, да маці-Беларусі.

У 2020 годзе выдавецтва «Народная асвета» выпусціла кнігу В. Гардзея «**Птушка года Беларусі, 2000 – 2020**», у якой аўтар змясціў свае вершы і замалёўкі пра ганаровых птушак нашай блакітнавокай радзімы.

Кніга створана з нагоды і ў падтрымку аднайменнага прыродазнаўчага конкурсу, які з 2000 г. праводзіць грамадская арганізацыя "Ахова птушак Бацькаўшчыны". Кожны год выбіраецца адзін від птушак, на якім сканцэнтроўваецца асветніцкая і ахоўная дзейнасць. Вершы і замалёўкі пра ганаровых птушак Беларусі суправаджаюцца шматлікімі фотаздымкамі вядомых беларускіх фатографаў. Адрасуецца чытачам сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту, настаўнікам, бацькам, усім, хто адчувае адказнасць за прыродныя скарбы сваёй Радзімы, каго цікавяць экалогія і культура Беларусі.









Плённа працуе творца і ў галіне **перакладу**, пра што сведчыць том казак народаў Еўропы “**Хрустальны калодзеж**”, які папоўніў серыю “Бібліятэка замежнай дзіцячай літаратуры”; раман Г. Флабэра “**Саламбо**”, што пабачыў свет у серыі “Школьная бібліятэка”. Для выдавецтва “Юнацтва” В.К. Гардзей пераклаў раман Р. Стывенсана “**Чорная страла**”, Э. Гофмана “**Шчаўкунчык і мышыны кароль**”, шэраг твораў з кнігі “**Казкі братоў Грым**”, паасобныя казкі Х. Андэрсена, Ш. Перо і інш.

У 2014 годзе выйшла кніга літоўскага аўтара Яронімаса Лаўцюса «**Азбука бяспекі**» у вершах для дзяцей. На беларускую мову яна была перакладзена В. Гардзеем. У кнізе расказваецца аб правілах бяспекі дзяцей, аб тым, што яны павінны ведаць аб правілах паводзінаў дома, на вуліцы, у дарозе, на прыродзе. Кніга дапаможа дзецям лепш зразумець і засвоіць асноўныя прынцыпы бяспечных паводзін. Акрамя гэтага, кніга будзе выдатным дарадцам і памочнікам настаўнікам, выхавацелям, бацькам – усім, хто клапоціцца аб здароўі дзяцей.



У сваіх творах Віктар Гардзей выступае адданым сынам, шчырым патрыётам палескай зямлі, якая сілкавала і натхняла яго на творчую дзейнасць. Вось чаму ў пісьменніка "ёсць патрэба бачыць родны дом". І ён, нягледзячы на сталічную занятасць, даволі часта наведвае Ганцаўшчыну — сваю стартавую пляцоўку ў вялікае жыццё і сапраўдную літаратуру.

Віктар Гардзей належыць да тых мастакоў слова, у каго асабліва цесныя сувязі са сваёй малой радзімай. Невыпадкова, што землякі ў гонар пяцідзесяцігоддзя пісьменніка **назвалі яго імем вуліцу**, на якой ён нарадзіўся і жыў. Імя пісьменніка ўвекавечана на **Алеі пісьменства** ў Ганцавічах, што была адкрыта ў 2011 годзе да Дня беларускага пісьменства.

Цяпер Віктар Канстанцінавіч на заслужаным адпачынку. Але гэта не азначае, што пяро адкладзена ў бок. З няменшай рэгулярнасцю мы сустракаем яго публікацыі на старонках перыядычных выданняў. Новых твораў В. Гардзея асабліва чакаюць яго землякі. Творчая актыўнасць пісьменніка спараджае ўпэўненасць, што свежыя вершы і апавяданні яшчэ будуць, і мы даведаемся пра лёсы як старых, так і новых герояў.